Основная часть. В исследовании принимали участие 13 учащихся 8—10 классов, которые являются участниками программы “ACCESS”, международного проекта, направленного на то, чтобы помочь подросткам из экономически неблагополучных слоев населения получить больше возможностей в сфере занятости, образования и жизни в целом. Данный проект способствует развитию коммуникативных навыков на английском языке, а также дает учащимся возможность проявить себя в различных видах деятельности, способствующих формированию лидерских качеств. Основу диагностики составляли опросные (анкетирование) методы и метод наблюдения.

Одним из ключевых понятий выступает «лидерство». Это набор характеристик, который формирует хорошего лидера. Некоторые характеристики, которыми обладают сильные лидеры, включают в себя знания об организации собраний, положительное отношение к окружающим, самоотверженность и приверженность своим целям, способность сохранять уверенность в своих силах, способность адаптироваться, способность планировать и ставить цели, сильный характер, терпимость и логику. Лидерство является одним из важнейших факторов групповой интеграции, способствующим достижению групповых целей с наибольшим эффектом. В сегодняшней конкурентной среде лидерские навыки становятся все более важными.

В теоретическом аспекте нашей научно-исследовательской работы проведён анализ лидерских качеств, описаны их основные категории, дана характеристика модели развития компетенций лидера, описаны её сущностные характеристики. В практическом аспекте — проведена диагностика уровня развития лидерских и коммуникативных навыков подростков, которые являются участниками международного проекта “ACCESS”; составлены и описаны тренинги, направленные на развитие лидерских компетенций; разработаны методические материалы, посвященные данной теме, а также ведётся YouTube канал, посвящённый развитию лидерства среди белорусской молодёжи.

Заключение. По итогам нашей работы можем констатировать, что наша модель лидерских компетенции, которая включает в себя управленческие (MQ), интеллектуальные (IQ) и эмоциональные (EQ) качества, предоставляет будущему лидеру все необходимые навыки для успешной работы. На основании этого исследования можно сделать следующие выводы: лидерские навыки и компетенции подростков значительно развились благодаря участию в проекте “ACCESS”. Каждый участник достиг своего личного успеха, а также научился работать в команде. Результатом совместной деятельности стало проведение различных мероприятий, тренингов, встреч и благотворительных кампаний. В результате исследования мы подтвердили, что уровень лидерских компетенций среди подростков может быть увеличен, если будет разработан и применен специальный набор мероприятий, направленных на развитие персональных характеристик лидеров.

Мы разработали 5 тренингов по лидерским навыкам, которые подразделяются на 4 группы: тренинги по самоорганизации, групповые тренинги, тренинги по управлению командой, тренинги по взаимодействию с внешним миром. Тренинги состоят из 4—7 заданий. Они помогают каждому учащемуся стать лидером в команде и узнать о развитии своих компетенций. Результаты исследовательской работы, представленной в первом сборнике учебных материалов, могут быть использованы для специального курса, уроков английского языка и некоторых занятий в молодежных клубах, а также для всех, кто заинтересован в формировании лидерских навыков.

Учебный канал, который разрабатывается и ведется на английском языке, позволяет широкой аудитории сетевых пользователей знакомиться с основными направлениями формирования лидерских компетенций.

УДК 811.161.3+811.111-26

А. С. Саматошанкава
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Ліцэй № 1 г. Баранавічы”, Баранавічы

СТРУКТУРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ САМАТЫЗМАЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ МОЎ)

Уводзіны. Мова — неабходная ўмова існавання і развіцця народа. У кожнага народа ёсць сваё ўспрыманне і інтэрпрэтацыя навакольнага асяроддзя, якія знаходзяць сваё адлюстраванне ў мове. Фразеалагічны склад мовы іграе важную ролю ў фарміраванні моўнай карціны свету. Фразеалагізмы адлюстроўваюць асаблівасці светаўспрымання народа, рысы нацыянальнай культуры, транслююць маральныя законы, выказваюць стаўленне чалавека да навакольнай рэчаіснасці.

Саматызмы (або саматычныя фразеалагізмы (СФ)), якія выступаюць прадметам нашага даследавання, вылучаюцца ў вельмі вялікую групу фразеалогіі любой мовы, што тлумачыцца перш за ўсё важнасцю ў жыцці людзей лексічнага поля, звязанага з саматызмамі. Лічыцца, што СФ складаюць каля 25 % усяго фразеалагічнага складу мовы. Шырокае выкарыстанне саматызмаў у складзе ўстойлівых элементаў мовы звязана з тым, што саматызмы з’яўляюцца найстарэйшым пластом у лексіцы розных моў і складаюць ядро асноўнага складу мовы. Таму супастаўленне гэтых груп фразеалагізмаў у беларускай і англійскай мовах (БМ і АМ) з’яўляецца цікавым і перспектыўным.

© Саматошанкава А. С., 2019

Рэпазіторый БарГУ

Актуальнасць распачатага даследавання звязана з усё большай цікавасцю да супастаўляльнага даследавання фразеалагічнага корпуса мовы і недастатковай вывучанасцю саматычных фразеалагічных адзінак у беларускай і англійскай мовах. Стрыжнёвымі паняццямі дадзенай працы выступаюць фразеалагічная адзінка і саматычны кампанент. Фразеалагічная адзінка — гэта моўны зварот, які складаецца з двух або больш слоў, валодае ўзнаўляльнасцю, устойлівасцю складу і структуры, а таксама цэласным значэннем. Саматычны кампанент — гэта лексічная адзінка, якая абазначае частку цела чалавека або жывёлы, якая з'яўляецца структурным кампанентам фразеалагізма.

Аб'ектам даследавання з'явіліся фразеалагічныя адзінкі БМ і АМ, у склад якіх уваходзіць саматычны кампанент. Корпус дадзеных адзінак быў атрыманы шляхам суцэльнай выбаркі са слоўнікаў "Longman Idioms Dictionary" і «Фразеалагічнага слоўніка беларускай мовы» пад рэдакцыяй І. Я. Лепешава. Аб'ём выбаркі налічвае 247 і 287 прыкладаў для БМ і АМ адпаведна.

Прадметам даследавання выступіў структурны аспект саматычных фразеалагічных адзінак БМ і АМ. Мэта даследавання — выявіць і супаставіць структурныя асаблівасці саматычных фразеалагічных адзінак (СФА) БМ і АМ.

Асноўная частка. Вывучыўшы лінгвістычную літаратуру па тэме даследавання і прааналізаваўшы адабраны матэрыял, трэба адзначыць, што СФА вылучаюцца ў даволі вялікую групу ва фразеалогіі абедзвюх моў, што тлумачыцца важнасцю ў жыцці людзей слоў-саматызмаў. Лічыцца, што СФА складаюць 20—25% ў фразеалагічным складзе мовы. Таму супастаўленне груп СФА ў беларускай і англійскай мовах з'яўляецца цікавым і перспектыўным. На падставе распачатага супастаўляльнага даследавання СФА БМ і АМ можна зрабіць наступныя высновы:

1. Саматычны момант прадстаўлены ў БМ і АМ шырока. Метадам суцэльнай выбаркі з лексікаграфічных крыніц мы вылучылі 247 і 287 адзінак з 40 і 64 саматычнымі кампанентамі ў БМ і АМ адпаведна. Напрыклад, *божы палец, язык на шарнірах, асакою скакаць у вочы, сядзець склаўшы рукі; a cold blood, a mouth to feed, weak at the knees, close to the bone*.
2. Найбольш актыўным саматычным кампанентам, які прымае ўдзел ва ўтварэнні фразеалагізмаў АМ з'яўляецца «*eye*» — вока, які сустракаецца ў 40 ФА, што складае 14% ад усёй выбаркі. Напрыклад, *have an eye for smth (разумець), keep an eye on smth (сачыць)*. У структуры ФА БМ найбольш частотным або актыўным з'яўляецца саматычны кампанент «рука». Дадзены кампанент сустракаецца ў 30 ФА, што складае 12% ад усёй выбаркі. Напрыклад, *трымаць сябе ў руках, адбівацца рукамі і нагамі*.
3. Супастаўляльны аналіз марфалагічнай структуры СФА БМ і АМ выявіў агульную рысу: дамінаванне дзеяслоўнай групы ў абедзвюх мовах, г.зн. групы СФА з дзеясловам у якасці галоўнага кампанента. Напрыклад, *to keep a civil tongue in one's head, to put one's hand to, блытацца пад нагамі, развесіць вушы*.
4. Найбольш прадуктыўным дзеясловам, які прымае ўдзел у будове СФА БМ і АМ, з'яўляецца дзеяслоў *to have і браць* адпаведна, прычым пры ўжыванні ў рамках вывучаных СФА для гэтых дзеясловаў характэрна агульнае сінанімічнае значэнне — «мець, валодаць». Напрыклад, *to have in the palm of one's hand, to have a sweet tooth, браць у свае рукі, браць за горла*.
5. Супастаўляльны аналіз сінтаксічнай структуры СФА БМ і АМ дазваляе сцвярджаць, што найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца СФА ў форме словазлучэнняў, як у БМ, так і ў АМ. Напрыклад, *in one's mind's eye, keep one's chin up, лезці (вылузвацца) са скуры, неў (пры) сваім розуме*.

Заключэнне. Такім чынам, з'яўляючыся часткай фразеалагічных сістэм няроднасных БМ і АМ, з боку структуры СФА валодаюць больш агульнымі, але не рознымі рысамі. На наш погляд, дадзены факт тлумачыцца тым, што фразеалагізмы як знакі намінацыі з'яўляюцца універсальнымі, характарызуюцца ўзнаўляльнасцю, асобнааформленнасцю, метафарычнасцю — гэта значыць, універсальным наборам структурных рыс ва ўзятых для даследавання моў. Наша даследаванне не закончана і мы можам выказаць здагадку, што адрозненні будуць выяўленыя ў семантыцы дадзеных фразеалагічных падсістэм, таму што семантыка заўсёды спалучаецца з менталітэтам, культурай і побытам моўных калектываў.

Тэарэтычная значнасць дадзенага даследавання заключаецца ў тым, што прадпрымаецца спроба супастаўлення структурных мадэляў СФА няроднасных моў (беларускай і англійскай) і выяўлення іх адрозненняў, асаблівасцяў.

Практычная значнасць працы звязана з тым, што яе вынікі — блок практыкаванняў — могуць быць карысныя школьнікамі пры вывучэнні фразеалогіі англійскай і беларускай моў, пры падрыхтоўцы да алімпіяд і цэнтралізаванаму тэсціраванню па дадзеных дысцыплінах.

Рэпазіторый ВаГУ